УДК 342.5(476)

# ХРЫШЧЭННЕ РУСІ ЯК ФАКТАР ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАГА ВЫБАРУ

**Мікалаева Людміла Віктараўна**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі
(г. Мінск, Беларусь)

*У тэксце дадзена характарыстыка уплыву прыняцця хрысціянства на тэрыторыі Старажытнарускай дзяржавы на палітычныя і грамадскія працэсы на беларускіх землях у X–XIII стст.*

Распаўсюджванне хрысціянства ў межах Старажытнай Русі з’яўлялася заканамерным працэсам, характэрным для значнай часткі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Ён суправаджаўся ўсталяваннем раннефеадальных дзяржаў. Хрысціянства дазваляла манархам абвясціць сваю ўладу свяшчэннай і аб’ядначь падданых агульным веравызнаннем. Славянскія народы прымалі хрысціянства як дзяржаўную рэлігію.

Пра тое, што выбар Русі на карысць усходняга адгалінавання хрысціянства быў зроблены не адразу, сведчаць нямецкія крыніцы. Яны паведамляюць, што ў 959 г. правіцельніца Русі княгіня Вольга (945–964) накіравала пасольства ў Германію да караля Атона I (936–973; імператар з 962 г.) з просьбай прысланць на Русь нямецкага епіскапа і святароў. Атон I загадаў рукапакласці для Русі епіскапа па імені Адальберт, які накіраваўся ў Кіеў у 961 г. Аднак нічога не дабіўшыся, ён праз год быў вымушаны вярнуцца назад [4, с. 303–308].

Такім чынам, у сярэдзіне X ст. Старажытнаруская дзяржава вяла палітыку актыўнага лавіравання паміж Заходняй і Усходняй хрысціянскай цэрквамі. Такая палітыка цалкам зразумелая, бо прыняцце хрысціянства на дзяржаўным узроўні зусім не вычэрпвалася хрышчэннем сям’і князя і яго атачэння. Галоўным было стварэнне ў краіне царкоўнай арганізацыі, а гэта было немагчыма без падпарадкавання пэўнаму царкоўна-юрыдычнаму цэнтру.

Выбар Уладзімірам у якасці афіцыйнай рэлігіі хрысціянства па праваслаўнаму абраду быў абумоўлены традыцыяй распаўсюджвання гэтай веры на тэрыторыі яго дзяржавы, наяўнасцю даўніх сувязей з Візантыяй – краінай з высокім узроўнем развіцця і культуры, нарэшце, найлепшай адпаведнасцю праваслаўя патрэбам дзяржавы з поліэтнічным насельніцтвам, якімі былі Візантыя і Кіеўская Русь [1, с. 57].

Беларускія землі па прычыне свайго геаграфічнага становішча на момант ажыццяўлення хрысціянізацыі апынулася на сутыку інтарэсаў двух адга-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку

лінаванняў хрысціянства. Падзел хрысціянства на каталіцызм і праваслаўе ў 1054 г. непасрэдна паўплываў на будучае беларускіх зямель, прадвызначыўшы на наступныя стагоддзі шмат у чым іх унікальнае геапалітычнае і культурнае становішча на сумежжы дзвюх культур і цывілізацый: праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-рымскай [5, с. 32].

Пытанне распаўсюджвання хрысціянства толькі падаецца лёгкім. Усім вядомы факт: 988 г. – вялікі князь кіеўскі Уладзімір хрысціў Русь. Але ёсць шмат праблем у тэме, што датычыць беларускіх зямель. Не распрацаваны пытанні часу ўстанаўлення хрысціянства як дзяржаўнай рэлігіі, распаўсюджвання ў прасторы і часе, замацавання ў свядомасці. Блытаніна прысутнічае і ў пытаннях аб шляхах пранікнення хрысціянства, як да яго ставіліся розныя колы насельніцтва, плямёны і этнасы.

Найбольш дадзеных маецца па тэрыторыі Полаччыны. Адносна пытання аб часе прыняцця хрысціянства большасць даследчыкаў лічаць, што ў час хрышчэння Старажытнарускай дзяржавы Полацкая зямля была ў яе складзе. Таму даты хрышчэння супадаюць. Для нас дата хрышчэння важная, бо з ёй супадае ўсталяванне ў Полацку дынастыі Ізяславічаў і пачатак імкнення да незалежнасці Полацкага княства.

Свой афіцыйны адлік гісторыя хрысціянскай царквы на беларускіх землях пачала з 992 г., калі хрысціянства яшчэ не зведала расколу 1054 г., з часу стварэння Полацкай епархіі. У 1005 г. была заснавана Тураўская епархія [2, с. 104; 3, с. 169, 172]. Аднак, магчыма, што хрысціянства было вядома на беларускіх землях задоўга да 992 г.

Пачатак масавага распаўсюджвання хрысціянства на беларускіх землях большасць даследчыкаў звязвае з палітыкай вялікага кіеўскага князя Уладзіміра. Ва ўсіх вядомых нам рэдакцыях і спісах «Аповесці мінулых гадоў» услед за летапіснай ацэнкай хрышчэння Русі: «Володимер же просвещен сам, и сынове его, и земля его», – ідзе аповяд аб раздачы вялікім князем сваім сынам важнейшых гарадоў Русі. Ізяслава, сына ад Рагнеды, ён зрабіў полацкім князем, Святаполка пасадзіў у Тураве. Не падлягае сумненню, што кіеўскі князь рабіў на іх стаўку ў правядзенні агульнадзяржаўнай палітыкі хрысціянізацыі ва ўдзелах [3, с. 171]. Пры іх у буйных гарадах княстваў пачалі стварацца епархіі – тэрытарыяльныя царкоўныя акругі, якімі кіравалі епіскапы. Епіскапскія кафедры былі духоўнымі цэнтрамі, з якіх распаўсюджвалася і ўмацоўвалася праваслаўная вера і развівалася царкоўна-рэлігійнае жыццё, утвараліся хрысціянскія абшчыны, будаваліся храмы, манастыры і школы. Даследчыкі лічаць, што першымі хрысціянскімі святарамі і епіскапамі на беларускіх землях былі грэкі і балгары [3, с. 172].

Пытанне наконт таго, у якой ступені ў часы Уладзіміра было ахоплена хрышчэннем насельніцтва беларускіх зямель, з’яўляецца дыскусійным. Трэба адрозніваць хрышчэнне ад хрысціянізацыі – доўгатэрміновага, складанага працэсу ўспрымання новай веры. Акт 988 г. быў пачаткам хрысціянізацыі, на фактычнае здзяйсненне якой спатрэбіліся стагоддзі. Даследчыкі гісторыі Полацкай зямлі лічаць, што двухвер’е захоўвалася тут да канца XII і нават у XIII ст. Новая вера сутыкнулася з моцнымі традыцыямі не толькі славянскага, але і балцкага язычніцтва.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Хрысціянізацыя Тураўскай зямлі пачалася пры Святаполку. Ён паказаў сябе прыхільнікам заходняга напрамку хрысціянства. У некаторай ступені з-за веры паміж Святаполкам і яго бацькам Уладзімірам адбылася сварка, у выніку якой тураўскі князь быў пасаджаны ў турму. Пазнейшая гісторыя Тураўшчыны было ўжо звязана з рэлігіяй кіеўскіх князёў. Аднак факты місіянерскай дзейнасці лацінскіх прапаведнікаў на Русі ў XI ст. не з'яўляюцца беспадстаўнымі. Заходняя царква таксама цікавілася пытаннямі хрысціянізацыі ўсходнеславянскіх зямель [3, с. 174–175].

Такім чынам, прыняцце хрысціянства з'явілася адной з важнейшых падзей гісторыі Беларусі. На працягу стагоддзяў праваслаўная царква аказвала моцны ўплыў на ўсе бакі жыцця нашых продкаў, на іх культуру, мараль, побыт. Хрысціянства прынесла на беларускія землі зусім новы светапогляд. Яно ўмацоўвала манагамную сям'ю, што станоўча адбілася на развіцці вытворчасці. Хрысціянізацыя спрыяла развіццю феадальных адносін, узмацненню княжацкай улады, умацаванню дзяржаўнай самастойнасці паасобных зямель. Прыняцце новай веры прывяло да ўстанаўлення больш цесных міжнародных сувязей з хрысціянскімі дзяржавамі. Прыняцце ўсходняга хрысціянства прадвызначыла культурнае збліжэнне з Візантыяй і краінамі ўсходнехрысціянскай рэлігійнай арыентацыі. Хрысціянства надало магутны імпульс культурнаму развіццю беларускіх зямель.

## Літаратура

1. Беларусь : страницы истории / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редсовет : А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 408 с.

2. Гісторыя Беларусі : дапаможнік. У 4 ч. – Мінск, БДУ, 2018. – Ч. 1. Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. / П. І. Брыгадзін [і інш.] ; пад рэд. П. І. Брыгадзіна, А. Г. Каханоўскага, С. М. Ходзіна. – 2018. – 351 с.

3. Гісторыя Беларусі : курс лекцый. У 2 ч. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000–2001. – Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст. / І. П. Крэнь, І. І. Коўкель, С. В. Марозава, С. Я. Сяльверстава, І. А. Фёдараў. – 2000. – 656 с.

4. Древняя Русь в свете зарубежных источников : Учебное пособие для студентов вузов / М. В. Бибиков, Г. В. Глазырина, Т. Н. Джаксон и др. ; Под ред. Е. А. Мельниковой. – М. : Логос, 2001. – 608 с.

5. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : Вучэбны дапаможнік для студэнтаў ФМА : у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2003–2004. – Ч. 1. Ад пачатку дзяржаўнасці да канца XVIII ст. – 2003. – 281 с.

Архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова